© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819-3625 № 10-2008



Андрэас Калівас

# Тыранія дыктатуры

## Калі грэцкія тыраны сустрэліся з рымскімі дыктатарамі

*Abstract.*

У артыкуле раскрываюцца асаблівасці інтэрпрэтацыі канцэптаў «тыранія» і «дыктатура» ў Антычнасці. Асноўная ўвага аддаецца поглядам двух грэцкіх гісторыкаў Дыянісія і Апіяна, якія ўпершыню зрабілі тоесным паняцці тыраніі і дыктатуры і запачаткавалі актуальную дасюль традыцыю выкарыстання гэтых тэрмінаў.

*Ключавыя словы:* Дыянісій, Апіян, тыранія, дыктатура, Афіны, Рым, дэмакратыя, рэспубліканізм.

Большую частку XX стагоддзя канцэпцы дыктатуры і тыраніі ўспрымаліся як сінонімы, дзве назвы аднае формы аўтакратычнага палітычнага кіравання. «Дыктатура», як пісаў у 1934 годзе Фосі Джон Коб Хіэншоў (Fossey John Cobb Hearnshaw), — «гэта форма кіравання, якую грэкі вельмі правільна звязвалі з тыраніяй» (Hearnshaw, 1934: 432; Mosca, 1939: 355, 486; Sartori, 1987: 204). Дыктатар і тыран былі злучаныя ў адну нелегальную, гвалтоўную, валюнтарысцкую фігуру, якая ўспрымалася як агульная пагроза для палітычнае свабоды, канстытуцыяналізму і ўлады закону (Bobbio, 1989: 166), — пагроза, што ў старажытнасці пазначылі як палітычнае рабства. Адпаведна на працягу ўсяго стагоддзя такая канцэптуальная ідэнтыфікацыя забяспечыла нарматыўныя рэсурсы для працаўнікаў сучаснага адраджэння дыктатуры. Ганьбаванне розных формаў сучаснае дыктатуры (правых і левых) як сучасных праяваў тыраніі хутка мабілізавалі гэтыя рэсурсы. Атаясамленне дыктатуры і тыраніі, тым не менш, не ёсць унікальным для XX стагоддзя. Зліццё тэрмінаў, характэрнае таксама для папярэдніх гістарычных перыядаў, нарадзілася ў рухомым кантэксце рэвалюцыйнага пад'ёму ў Еўропе і заморскіх калоніях ва ўмовах заняпаду манархічнага ладу (Millon-Delson, 1997: 245—251). Клод Ніколт (Claude Nicolet) правільна заважыў, што «з XVIII стагоддзя тэрмін "дыктатура" скарыстоўваўся для спасылкі на дэспатызм ці тыранію. Іншымі словамі, формы ўлады, якія вельмі далёкія ад рэгулярнага абмеркавання ды ўзгаднення і замест гэтага маюць у аснове узурпацыю праз сілу ці падман» (Nicolet, 2004: 263).

Канцэптуальнае паяднанне дыктатара і тырана супадае з радыкальнай трансфармацыяй заходняга грамадства і палітыкі ў эпоху сучасных дэмакратычных рэвалюцый, прававой рацыяналізацыі, паступовага ўлучэння новых групаў у прастору фармальнае палітыкі, а таксама пасляховымі спробамі інстытуцыйна ўваскрасіць рымскую дыктатуру такімі палітычнымі постацямі, як Кромвель, Напалеон і якабінцы[1].

Наратыў Ніколта дакладна схоплівае сучаснае змяшэнне гэтых двух тэрмінаў і правільна лакалізуе іх у больш шырокі гістарычны рух, звязаны з распаўсюджваннем рэспубліканізму (Nicolet, 1994: 101—105). Але такая гісторыя ёсць не поўнаю, бо не заўважае больш ранніх момантаў заходняе палітычнае гісторыі, калі дыктатар толькі пачаў выглядаць так небяспечна, як і тыран. Гэта адбылося ў неспакойны пераходны перыяд паміж Рымскай рэспублікаю і прынцыпатам Сулы і Цэзара, што спалучалася з іх барацьбой за вярхоўную ўладу. Усё названае стала істотным выпрабаваннем інстытута дыктатуры (Hinard, 1988: 87—96). «Злоўжыванне» надзвычайным інстытутам, выкарыстанне яго за межамі вызначаных і ўсталяваных прававых ра-

[1] Магчыма, Кромвель быў першым у гісторыі, каго многія яго сучаснікі прызналі і тыранам, і дыктатарам (Jeannin, 1982: 143—158; Zaller, 1993: 585—610).

мак, зручнасць для прасоўвання асабістых амбіцый і нават барацьбы супраць самой рэспублікі, прывялі да істотнага пераасэнсавання прыроды, функцый і каштоўнасці старажытных інстытутаў.

Абодва грэцкія гісторыкі ранняга і высокага імперскага перыяду Дыянісій Галікарнаскі (60 г. да н. э. — пасля 7 г. да н. э.) і Апіян Александрыйскі (95—165 гг. н. э.) адчувалі гэтую радыкальную пераацэнку, у той час як большасць летапісцаў і рэспубліканскіх гісторыкаў чулліва ставіліся да памяці пра рэспубліку і яе інстытуты, сярод якіх дыктатура мела самыя высокія ацэнкі. Логіка тэкстаў абодвух грэцкіх аўтараў развіваецца іншым шляхам (Cornell: 74, 80—81; Gabba, 1991: 10—11, 21—22, 87—96, 152; Mansfield, 1989: 84—85; Bucher, 2000: 411—458). Іх гісторыі ўтрымліваюць свежую пераацэнку надзвычайнае пасады дыктара, якую яны разглядалі, выкарыстоўваючы канцэпцыі і метады, запазычаныя з класічнае грэцкае традыцыі (Nicolet, 1994: 35—36, 38; Schultze: 128; Gabba, 1991: 23—59; Fox, 1993: 42; Gowing, 1992: 283—287; Turchetti, 2001: 162—164). У іх грэка-рымскім сінтэзе дыктатура апісаная па-новаму, як «часовая тыранія па дазволе, згодзе», а тыран — гэта «пастаянны дыктатар». Гэты гістарычны і канцэптуальны рэвізіянізм выклікаў параўнальнае даследаванне рымскага інстытута дыктатуры і грэцкай тэорыі тыраніі з пэўнымі істотнымі вынікамі. Грэцкая гісторыя Апіяна і Дыянісія ўключае крытычнае пераасэнсаванне дыктатуры і яе здольнасць захоўваць канстытуцыйны парадак (Dionysius, V: 70—77, 211—237; Appian, I: 98—115, 181—215). Ці было злоўжыванне інстытутам рымскае дыктатуры выпадковым або вынікам маральнага заняпаду ці прычына ў яе неўтаймаванай прыродзе?

Здаецца, што два гісторыкі былі не толькі ўцягнутыя ў перапісванне рымскае гісторыі ці рэвізію класічных канцэпцый: яны былі залучаныя ў крытычныя дэбаты пра інстытут дыктатуры як такі. Верагодна, што закон Марка Антонія, які афіцыйна забараніў дыктатуру у 44 г. да н. э. (*Lex Antonia de dictatura in perpetuum tollenda*) выклікаў гэтыя дэбаты (Cicero, 1: 23; 36: 155; Appian, III: 25, 565; Dio Cassius, 54: 51, 401; 54: 2: 283—285). Адпаведныя спрэчкі ўзняліся з новаю сілаю, калі два дзесяцігоддзі пазней сенат і народ спрабавалі аднавіць інстытут, двойчы прапаноўваючы Аўгусту дыктарства, ад якога ён, зрэшты, адмовіўся (Res Gestae..., 2002, 5: 353; Mommsen, IV, 1894: 428—429, 436—438; Syme, 2002: 53—54; Kaplan, 1977: 6, 165). Яшчэ больш важна, што гісторыі Дыянісія і Апіяна ўтрымліваюць выклік рэспубліканскаму рэжыму ў цэлым, наўпрост абвінавачваючы яго ва ўласным калапсе (Schultze: 131—134; Bucher: 431, 433—437, 441). У адрозненні ад Лівія і Салуста, якія прыпісвалі падзенне рэспублікі розным вонкавым прычынам і іх разбуральнаму эфекту (Gabba, 1991: 211—213), аналіз Дыянісія і Апіяна аддае перавагу нутраным прычынам адпрыроднай нестабільнасці, заняпаду і, нарэшце, падзення рымскае рэспублікі. Гісторыі грэцкіх аўтараў радыкальна пераінтэрпрэтавалі і паставілі пад пытанне інстытут дыктатара. Такім чынам, гэтая ўражальная рэспубліканская інстытуцыя, постаць гранічнага абаронцы рымскае канстытуцыі, сустрэла сваю першую крытыку.

Натуральна, я не збіраюся супрацьпастаўляць Дыянісія з Апіянам і больш знакамітых і ўплывовых тагачасных гісторыкаў у імя нейкае аб'ектыўнае праўды пра сапраўдныя ўласцівасці рымскіх інстытутаў дыктатуры. Хутчэй, я спрабую паказаць станаўленне дыскурсійнага сутыкнення тыраніі і дыктатуры, у прыватнасці тое, якім чынам два канцэпты паступова пачынаюць набываць новае значэнне, пакуль не зліваюцца цалкам. Праз атаясамленне рымскага дыктатара з грэцкім тыранам Дыянісій і Апіян прапанавалі новае разуменне надзвычайнае ўлады і паставілі пад пытанне традыцыйныя палітычныя погляды і філасофскія перакананні. Як мне падаецца, грэцкія гісторыкі пачалі радыкальную канцэптуальную трансфармацыю мовы класічнае палітыкі. Яны змясцілі новую палітычную гісторыю, новыя значэнні і каштоўнасці ў нетры больш шырокай катэгорыі тыраніі. У выніку дыктатура атрымала ўласцівасці полівалентнасці і неадназначнасць, якіх раней не мела і якія прывялі да тыранічнага апісання інстытута дыктатараў.

Першая частка гэтага эсэ ўзнаўляе інтэлектуальны фон да з'яўлення працаў Дыянісія і Апіяна для таго, каб зразумець інавацыйны характар іх падыходаў. У той час атаясамленне дыктара і тырана не было відавочным і прызнаным поглядам на палітыку. Хутчэй, нормаю лічылася ўспрымаць тыранію сапсаванай формаю манархіі, паталагічнае гіпертрафаванне манархічнае ўлады, скарыстанай несумленным царом (Polybius, VI: 7—8: 283—285; Cicero, I: 33, 42: 77, 97—99; II: 26—29, 32: 150, 167—169; Dunkle, 1971:12—20; Michel, 1969: 22—27). Такім чынам, звычайна тыран быў менавіта дрэнным царом (*regis injusti*) (Aristotle, VIII: 10: 491; Cicero, II: 27: 159). У гэтым кантэксце гістарычныя творы Дыянісія і Апіяна прадстаўлялі вырашальны зрух у гісторыі палітычнага канцэп-

ту. У частцы другой і трэцяй разглядаецца, як Дыянісій і Апіян замяняюць традыцыйны інтарэс да сувязі паміж каралём і тыранам новай цікавасцю да лучнасці тырана і дыктатара. Абодва грэцкія гісторыкі ўбачылі дыктатара і тырана практычна ідэнтычнымі, такім чынам размываючы папярэднія эмпірычныя, аналітычныя і нарматыўныя адрозненні паміж імі. Такое размыванне рэалізавалася як сур'ёзная перапрацоўка класічнае тэорыі тыраніі і зыходзіла з больш кананічнае дэфініцыі гэтага феномену. У частцы чацвёртай разглядаюцца пэўныя вынікі і высновы з параўнання тыраніі і дыктатуры, уключна з магчымай сувяззю падзення рэспублікі і фатальных наступстваў асобных канстытуцыйных правоў і інстытуцыйных дэфектаў. У выніку свайго аналізу Дыянісій і Апіян дэміфалагізавалі інстытут дыктатуры праз развейванне яго рэспубліканскай аўры. У больш агульным сэнсе іх падыход перапрацаваў адносіны Афінскай дэмакратыі і Рымскае рэспублікі, пазначаючы ключавыя адрозненні паміж двума рэжымамі. Гэтыя адрозненні, дарэчы, патэнцыйна могуць зрабіць унёсак у сучасныя дэбаты пра інстытут надзвычайнай выканаўчай улады і канстытуцыйную дыктатуру ў дзяржавах ліберальнае дэмакратыі.

## I. Манарх, Дыктатар і Тыран

Ціт Лівій прапанаваў гістарычна ўплывовую ацэнку паходжання дыктатуры (Livy, II: 18: 275—277; Cicero, II: 56: 69—71; Cohen, 1957: 300—318). У 501 годзе да н. э., некалькі гадоў пасля выгнання апошняга цара Тарквінія Супербус, перад тварам знешняе пагрозы, выкліканае агрэсіяй суседніх плямёнаў, быў прызначаны першы дыктатар, што адбылося праз ухваленне закона *lex dictatore creando* (Livy, II: 18: 275—277; Keyes, 1917: 298—305; Mommsen, 1893: 163; Lintott, 1999: 109—113). Такім чынам, прызначэнне, як падаецца, было канстытуцыйным і адпавядала пэўным усталяваным правілам і працэдурам. Публічнае з'яўленне дыктатара выклікала «вялікі страх» сярод плебеяў, раптоўны жах перад энергіяй дыктатарскай улады, улады па-за межамі апеляцыі і пярэчанняў. Гэта зрабіла плебеяў паслухмянымі і спрыяла заваяванню ворагаў ды абароне народжанай рэспублікі (Livy, II: 18: 277; Cicero, I: 60: 95; Nicolet: 30).

Акрамя фактару страху і моцнага эфекту паслухмянасці, які забяспечвала і дыктатура, і тыранія, наратыў Лівія ніякага іншага падабенства не дапускае. Такая сітуацыя не павінна здзіўляць. З першага сутыкнення дзвюх канцэпцый у ранняй Антычнасці, калі Рым пашыраўся на ўсход і вобраз тырана быў прыўнесены ў рэспубліканскую мову палітыкі і літаратуру, мы знаходзім дакладны канцэптуальны падзел працы (Dunkle: 153—156; Béranger, 1935: 89—90; Turchetti:160—164; Ferrary: 97—105; Wood, 1988: 155—158). Тыранія займае фіксаваную і добра вызначаную пазіцыю ў рымскай свядомасці, выразна і без сумневу розніцца ад дыктатуры. Два канцэпты вызначылі непадобныя формы палітычных правілаў, маючы супярэчлівыя, нават антынамічныя значэнні. Дыктатар вызначаўся як легальная і нармальная, хоць і надзвычайная пасада, скіраваная на абарону агульнага дабра ў час крызісу і небяспекі. Тыранія інтэрпрэтавалася як несправядлівая і гвалтоўная ўлада, разбурэнне агульнага дабра і падзенне сапраўднае легальнасці і свабоды.

Многія адрозненні, якія разводзілі дыктатара і тырана былі, сапраўды, занадта відавочныя і істотныя, каб іх ігнараваць. Дыктатар быў канстытуцыйным інстытутам, які прызначаўся легальна на падставе супрацоўніцтва органаў вышэйшае рэспубліканскае ўлады і ў адпаведнасці з тым, што «загадваў закон» (Livy, II: 18: 275—276; Mommsen, III: 162—163). Тыран атрымоўваў уладу мінаючы канстытуцыю: праз сілу, падман і гвалтоўнае пераварочванне існага рэжыму (Aristotle, V: 10: 457; Plato, VIII: 19: 333; II: 3: 117—119; Diogenes Laertius, III: 83: 349; Heredotus, I: 8—15: 11—19; Cicero, I: 64: 101—103). Больш за тое, дыктатар меў канкрэтнае прызначэнне — знішчэнне пагрозы падчас крызісу і вяртанне да *status quo ante bellum*. Калі выратаванне і ўсталяванне канстытуцыі былі жорсткім абавязкам дыктатара, такіх правілаў не існавала для тырана, дзеянні якога былі адвольныя і непрадказальныя, скіраваныя на задавальненне асабістых жаданняў і прыватных інтарэсаў (Aristotle, IV: 8: 327; VI: 2: 507; Polybius, VI: 7: 283—284). Дзеянні дыктатара ў цэлым лічыліся грамадскім імкненнем да агульнае карысці, рэальнай праявай патрыятычнай адданасці грамадзянаў рэспублікі. Дыктатар быў вартавым рэспубліканскага парадку, тыран — яго узурпатарам. Калі коротка, то дыктатар быў слугою, якія абараняў тое, чым тыран жадаў авалодаць.

Адрозненняў шмат. Найбольш важным, магчыма, было тое, што інстытут дыктатуры меў часавыя межы (Cicero, III: 3: 467). Кіраванне дыктатара ніколі не магло быць большым за перыяд у 6 месяцаў, пасля паспяховага завяршэння сваёй місіі ён павінен быў скласці паўнамоцтвы. Тыран, у сваю чаргу, імкнуўся ўзяць кантроль над кіра-

ваннем для таго, каб трымаць яго бестэрмінова. У той час як дыктатар адкладаў дзеянне канстытуцыі ці яе частак на абмежаваны перыяд, тыран рабіў гэта на нявызначаны час, нармалізуючы сваё кіраванне і імкнучыся зрабіць яго звыклым для людзей (Aristotle, V: 9, 10—11: 467). Дыктатура была выключная і тэрміновая, тыранія — «ненатуральная» і пастаянная (Aristotle, III: 11: 269—271; V: 9: 459—475; Plato, VIII, 137—139; Nicolet, 2004: 265; Jerphagnon, 1984: 39—50). Праз тое, што дыктатар не меў заканадаўчай ўлады, якую тыран проста узурпаваў, ён не мог мадыфікаваць, змяняць ці адмяняць канстытуцыйную структуру, самае вялікае —толькі адкласці яе дзеянне. Такім чынам, калі дыктатар апеляваў да выключэнняў для выканання нормаў, тыран спрабаваў нармалізаваць выключэнні. Нарэшце, рымская дыктатура не была сама па сабе формаю кіравання, але, хутчэй, інстытуцыйным кампанентам больш шырокага рэспубліканскага рэжыму. Тыранія, наадварот, звычайна ўспрымалася як тып рэжыму сам па сабе, хоць перверсіяй і адхіленнем ад справядлівых формаў палітычнага кіравання.

Старажытныя рымляне ведалі гэтыя адрозненні. Тым не менш, былі пэўныя вядомыя падабенствы паміж дыктатураю і тыраніяй, што не маглі пазбегнуць увагі. Напрыклад, дыктатура і тыранія былі моцна звязаныя з манархічным кіраваннем, у прыватнасці з іх моцным персаналісцкімі і аўтакратычнымі версіямі. У працах Палібія і Цыцэрона падабенства адлюстраванае ў глыбокіх і асаблівых адносінах абодвух канцэптаў з інстытутам манарха.

Тут, тым не менш, існуе нязначнае, але паказальная адрозненне паміж рымскімі філосафамі і грэцкімі гісторыкамі. Цыцэрон, як і Палібій, лічыў тыранію скажонай формаю манархіі і адначасова ўспрымаў дыктатуру як вырашальную высокую ўладу з паўнамоцтвамі для пераадолення сілаў распаду. Інстытут дыктатара захаваў найлепшае з таго, што магла прапанаваць манархія «для таго, каб бяспека пераважала над свавольствам» (Cicero, I: 30: 95; Schmitt, 1994: 2l; Rossiter, 2004: 17—18). Цыцэрон бачыў спадчыну манархічнае ўлады (асабліва ў патрэбах вайны ці грамадскіх беспарадкаў) у інстытуце і практыцы дыктатуры (Cicero, I: 40—43: 93—101; II: 26—30, 32: 157—163, 169; Béranger: 89—90). Для яго дыктатура была рэліктам манархіі, неабходная, але часовая саступка на карысць каралеўскай улады і карыснае вяртанне да формы адкрытага персаналісцкага кіравання (Rossiter: 17). У выпадку надзвычайнае сітуацыі паўнамоцтвы манарха адраджаліся такім чынам, каб пакінуць збоку абмежаванні, навязаныя калегіяльнымі пагадненнямі, змяшаным характарам рэспублікі і спецыяльным скарачэннем юрысдыкцыі. Для Палібія манархічнае паходжанне тыраніі перш за ўсё тлумачыць яе заганныя празмернасці (Polybius, VI: 7: 284—285). У сваёй вядомай цыклічнай тэорыі змены рэжымаў Палібій апісваў, як абсалютная ўлада караля абавязкова дэградуе ў тыранію, гэта значыць паўнамоцтвы пераўтвараюцца ў прыладу ўладара для бязмежнага задавальнення яго незвязаных законам жаданняў і памкненняў. Для Палібія, такім чынам, тыранія прадстаўляе найгоршыя бакі манархіі, дэвіяцыю ад правільнае формы кіравання і абавязкова саслізгвае ў беззаконне.

Будзе няправільным недаацэньваць адрозненні паміж дыктатураю і тыраніяй, якія ўзніклі на аснове супрацьпастаўлення фігуры дыктатара — як добрага і часовага, тырана — як несправядлівага і карумпаванага манарха. Такім чынам, нават з улікам таго, што разуменне дыктатуры Цыцэрона ўтрымлівае пазітыўныя элементы манархіі, а канцэпцыя тыраніі Палібія ўключае яе негатыўныя аспекты, абедзве канцэптулізацыі выяўляюць падабенства гэтых інстытутаў каралеўскай улады, ці, як апісаў гэта Дыян Касій, «любоў да манархіі» (*έρωτα μοναρχία*) (Dio Cassius, IV: 13 (Zonaras): 109). Падабенства паміж дыктатураю і манархіяйаднаўляе раннія грэцкія тлумачэнні прыроды тыраніі, якія мелі на ўвазе пэўную агульную прыроду дыктатуры і тыраніі. Адно з падабенстваў — патрабаванне вярхоўнае ўлады (*κύριος πάντων*, *majus imperium*), якая раней трымалася легітымным манархам (Aristotle, III: 4: 201, III: 9: 249; Polybius, III: 86, 87: 213, 215; Cicero, I: 32: 77, I: 60: 95, II: 32: 169). У адпаведнасці з гэтым поглядам вярхоўная ўлада над жыццём і смерцю, улада без калегіяльнасці, характарызуе і дыктатуру, і тыранію. Такая аўтакратычная форма ўлады сцвярджае яшчэ адно падабенства паміж двума канцэптамі — нявызначаныя і нацягнутыя адносіны з усталяваным прававым парадкам і іх небяспечная блізкасць да аноміі. Рымляне правялі тонкую лінію, якая аддзяляла манарха ад тырана ў залежнасці ад таго, ці кіраваў манарх у адпаведнасці з законам або ўласным жаданнем. Гэты крытэр выкарыстоўваўся для вызначэння сілаў распаду і пагаршэння, якія трансфармавалі манарха ў тырана.

Зусім не дзіўна, што пагрозлівыя інцыдэнты з Сулаю (82—79 гг. да н. э.) і Цэзарам (49 гг. да н. э., 48—47 гг. да н. э., 46—45 гг. да н. э., 45—44 гг. да н. э.) урэшце прыцягнулі большую ўвагу

да падабенства, заклікаючы да сур'ёзнай праверкі інстытута дыктатуры. Дыянісій, як падаецца, першы ажыццявіў такую рэвізію, Апіян быў другі. Дыянісій, у супрацьвагу Лівію, пісаў сваю гісторыю Рыма напрыканцы бурлівага пераходнага перыяду паміж позняй рэспублікай, яе падзеннем і кансалідацыяй імперскае манархіі. Яго «*Roman Antiquities*», якая складалася з 20 кніг, пачала выходзіць у 7 г. да н. э., прыкладна праз два дзесяцігоддзі пасля яго пераезду ў Рым, у час, калі праблема дыктатуры зноў стала прадметам дыскусіі, патрабуючы новых гістарычных і палітычных варыяцый. У значнай ступені, магчыма, праз няясную пазіцыю позніх твораў Цыцэрона пра Цэзара і Антонія. У адрозненне ад яго калег-гісторыкаў Дыянісій распрацаваў асаблівае разуменне дыктатуры, прапанаваў новую гісторыю яе ўзнікнення і эвалюцыі, зноў падцвердзіўшы яе далучанасць да падзення рэспублікі.

Апіян быў паслядоўнікам і распрацаваў далей падыход Дыянісія да дыктатуры, але завяршыў сваю Рымскую гісторыю на паўтара стагоддзя пазней, у 162 г. н. э., ва ўмовах росквіту і адноснае стабільнасці імперскае ўлады. З сітуацыі пераваг кансалідаванае імперскае манархіі Апіян паглядзеў назад на нестабільнасць рэспублікі і звязаў інстытут дыктатуры з серыяй разбуральных і гвалтоўных грамадзянскіх канфліктаў, якія прывялі да калапсу *res publica*. Надзвычайная інстытуцыя дыктатуры адыграла вырашальную ролю ў павольным і балючым спаўзанні рэспублікі ў беспарадак і рознагалоссе. Непасрэднае ўмяшанне дыктатара ў палітыку і сацыяльныя канфлікты заняло значнае месца ў апісанні Апіянам паступовага распаду і канчатковае смерці рэспубліканскіх інстытутаў. У творах Апіяна дыктатура засталася там, куды яе спусціў Дыянісій з велічнага канстытуцыйнага п'едэстала ў пазіцыю безнадзейна скампраметаваную асацыяцыяй з тыраніяй.

## II. Дыянісій і выбарная тыранія дыктатара

Версія Дыянісія гістарычнага паходжання першае дыктатуры кардынальна розніцца ад Лівіевай і нават па часе не суадносіцца з ёй. Некалькі прыкладаў дэманструюць дадзенае разыходжанне. Першае, Дыянісій лакалізаваў прызначэнне першага дыктатара 498 г. да н. э., гэта значыць трыма гадамі пазней, чым Лівій. Больш важна, ён знізіў уплыў знешніх фактараў у стварэнні інстытута (Gabba, 1991: 140—141; Lintott: 110; Mommsen, III: 163; Martin, 1982: 302). Дыянісій апісвае нараджэнне крохкага рэспубліканскага парадку, які змагаецца за баланс і стабільнасць. Высокая палярызацыя грамадства, расколатае праблемаю даўгоў, перыядычныя народныя хваляванні стваралі спецыфічны кантэкст пошуку шляхоў выжывання. У гэтым хуткаплынным і нестабільным постманархічным кантэксце Дыянісій дакладна спалучыў рэспубліканскі генезіс дыктатуры з крытычнымі, фундаментальнымі і жорсткімі дэбатамі пра палітычную ідэнтычнасць рэспублікі, размеркаванне свабоды, абарону парадку, уласцівых нормаў і інстытутаў.

Дыянісій вызначыў у якасці асноўнае прычыны ўсталявання дыктатуры закон, прапанаваны консулам Публіем Валерыем (Publius Valerius) — Publicola — і ратыфікаваны народам. Гэты закон выклікаў спрэчкі, якія далей вылiліся ў канфлікт па пытанні доўгу, што ставіла пад пагрозу маладую рэспубліку (Dionysius, V: 70: 211; Cicero, II: 31: 165). Закон Publicola значна ўзмацніў пазіцыі плебеяў праз прадстаўленне права апеляваць (*ius provocationis*) да грамадзянаў Рыма і вызначыў, што ніякі рымлянін не можа быць пакараны без суда. Такім чынам, былі пастаўлены па-за законам паўнамоцтвы магістрата выносіць смяротнае пакаранне без рашэння народнага суда, якія складаўся з роўнымі (*provocation ad populum*) (Lintott: 33). Права апеляцыі было такім чынам усталявана як абарона плебеяў ад палітычнага і сацыяльнага дамінавання патрыцыяў у рэспубліцы. Бок абароны атрымаў магчымасць патрабаваць перагляду рашэнняў консула праз народ і яго сходы (Dionysius, V: 70: 211—215; Livy, II: 7—8: 239—245; Plutarch: 531—535). Гэта была навацыя, якую і Цыцэрон, і Лівій прызналі ў якасці «унікальнае абароны свабоды». Тым не менш, як паведамляе Дыянісій, для таго каб «прадухіліць незадаволенне плебеяў», сенат прапанаваў увядзенне новае надзвычайнае пасады, якая атрымоўвала «ўладу над вайной і мірам і ўсімі іншымі справамі, валодала абсалютнай уладаю і непадпарадкавалася ў сваіх планах і дзеяннях (Dionysius, V: 70: 211).

Дыктатура была, такім чынам, спецыяльна распрацаваная для таго, каб спыніць палітычныя амбіцыі большасці, і «да той ступені, якая не дазволіць бедным стварыць значную апазіцыю», а менавіта: «прапанаваў увесці пасаду з уладаю, роўнай тырану (*ισοτυρσννον αρχήν*), якая павінна была быць вышэйшай за ўсе законы» (Dionysius, V: 70: 213). Дыктатар (*δικτάτορας*) быў абраны як супрацьвага праву апеляцыі. Як паведамляе Ды-

янісій, «пакуль гэты закон заставаўся ў сіле, бедныя не маглі быць поўнасцю падпарадкаваныя магістратам... такім чынам, калі б гэты закон быў адменены, усе адчувалі б вялікую патрэбу ў падпарадкаванні» (Dionysius, V: 70: 213).

З дыктатарам, як прызнаваў сам Лівій, «больш не было ні апеляцыі, ні выратавання» (Livy, II: 18, 29—30: 277, 313—315; Mommsen, IV: 461). Плебеі ў выніку ратыфікавалі прапанову сената па ўвядзенні надзвычайнае пасады, як адзначаў Дыянісій, патрыцыі падманулі і ўвялі народ у зман, каб яны прагаласавалі супраць уласных інтарэсаў, падтрымліваючы адмену закону, якія ахоўваў іх свабоду (Dionysius, V: 70: 215). Новы дэкрэт быў адразу прыняты да выканання. Сенат абдумаў і прызначыў першага дыктатара для аднаўлення парадку. Пасля таго як ён «запужаў неспакойных і бунтаўнікоў», быў праведзены перапіс насельніцтва, заключанае гадавое перамір'е з варожымі Рыму суседзямі і дыктатар падаў у адстаўку (Dionysius, V: 70: 229).

Падыход Дыянісія да апісання падзеяў не толькі больш дэталёвы, чым Лівія, але і больш далікатны з сацыялагічнага пункту гледжання і палітычна больш уважлівы. Ён асацыюе стварэнне дыктатуры з сацыяльным змаганнем, балансам улады паміж варагуючымі класамі, іх стратэгічнымі планамі і пачуццём уласных інтарэсаў, і асабліва з ростам палітычнага, прававога і сацыяльнага значэння бедных пасля выгнання манарха (Gabba, 1991: 140). Такім чынам, у нарратыве Дыянісія дыктар ад пачатку з'яўляецца як палітычны інструмент арыстакратыі, скіраваны на задушэнне ўнутранага неспакою і захаванне інтарэсаў і ўлады патрыцыяў (Dionysius, V: 70, 71: 213, 215, 217).

Дыянісій вызначыў увядзенне інстытута дыктатара як «выбарную тыранію» (*αἱρετὴ τυραννίς*), такім чынам радыкальна змяняючы яе значэнне ў кантэксце рымскае палітычнае думкі (Dionysius, V: 73: 223). Крытычны ўдар рашучага гістарычнага рэвізіянізму Дыянісія будзе больш адчувальны ў святле яго, без сумневу, адмоўнага погляду на тыранію. У гэтых крытычных дыскусіях Фукідыд, для прыкладу, паказваў тыранію як дрэнную форму палітычнае ўлады, якая выключае многіх з агульнага жыцця праз пазбаўленне іх сродкаў, якія для ўсіх зручныя і карысныя (Gabba, 1991: 140). Гэтае сінаптычнае незадавальненне рэзануе па ўсёй рымскай гісторыі Дыянісія. У адпаведнасці з рэканструкцыяй гісторыка інстытут дыктатуры выглядае хутчэй як палітычная зброя ў грамадзянскай барацьбе Рыма, чым ваенная пасада, скіраваная на знешніх ворагаў (Gabba, 1991: 140). Сенат ад пачатку стварыў дыктатуру як інстытут унутранага надзвычайнага становішча. Яе мэтаю было распаўсюдзіць страх і пачуццё небяспекі сярод непадпарадкаваных мас і адмяніць, калі гэта патрэбна, прыватныя сродкі абароны і правы, а таксама задушыць народныя хваляванні, абараніўшы інтарэсы і прывілеі патрыцыяў. Менавіта таму Тэадор Мамзэн заўважыў, што «пасля падзення манархіі, задушэнне дыктатуры стала ў Рыме мэтаю партыі свабоды» (Mommsen, IV: 187).

Як вярхоўная прылада рэпрэсій, вынік «арыстакратычнае змовы», створаны для сітуацыі класавае вайны, дыктатура непазбежна мілітарызавала палітычныя сутыкненні (Gabba, 1991: 140). Як вядома, першай архаічнай назваю дыктатара была *magister populi,* што адлюстроўвае першапачатковую функцыю ваеннага камандуючага (Cicero, I: 63: 95; III: 3: 467; Lintott: 110). Дыктатура не толькі крыміналізавала палітычныя канфлікты і мілітарызавала горад, але і трансфармавала палітычных праціўнікаў у *hostis,* грамадскіх ворагаў, супраць якіх дыктар мог легальна прымяняць на поўную сілу законы вайны (Mommsen, III: 187). Як зазначыў Клінтан Розітэр (Clinton Rossiter), «узнаўленне дыктатараператварала Рымскую рэспубліку і яе складаную канстытуцыю ў самую простую і абсалютную сярод усіх іншых формаў кіравання — узброены лагер, узначалены незалежным і безадказным генералам (Rossiter: 25). Усё гэта нагадвае сітуацыю ў Грэцыі. Тыраны «добра ведалі, што ўсе, хто супраць іх тыраніі, з'яўляюцца іх ворагамі (*ἐχθροί*)», як лямантаваў Ксенафонт, бо яны жывуць «у стане перманентнае вайны» (Xenophon, 4: 35; 6: 29). Тыранія была ўладаю без сяброў, і мілітарызацыя палітыкі лічылася вызначальным атрыбутам тыранічнага кіравання (Aristotle, VIII: 12: 497—499). Арыстоцель у гістарычным і кампаратыўным даследаванні па прыродзе гэтае формы бязмежнае ўлады паўтарае: тыран — гэта стваральнік вайны, *πολεμοποιός* (Aristotle, V: 9: 463). Тыранічны горад быў заўсёды пад асадаю, тое самае было з Рымам пад уладаю дыктатараў (Mommsen, III: 187; Rossiter: 25).

Такое падабенства, магчыма, стала асноваю для рэдэфініцыі Дыянісіям дыктатуры як «выбарнае тыраніі». З аднаго боку, дыктатура была тыранічнай, бо яна мела ўласцівасці абсалютнай і невымернай, скіраванай на радыкальнае выкарыстанне сродкаў гвалту, магчымасць разбураць закон па ўласным жаданні, яна пагражае жыццём, свабодаю і маёмасцю і адначасова шукае аба-

роны асобных класавых інтарэсаў супраць агульнага грамадскага дабра. З другога боку, яна была выбарная. Народ добраахвотна і часова ахвяраваў сваімі свабодамі, калі ўхваліў прапановы сената. Тое, што народ быў падмануты і зманіпуляваны, як сцвярджаў Дыянісій, не змяняе факта, што ўрэшце ён санкцыянаваў новы закон, такім чынам падпарадкаваўшыся «валюнтарысцкаму тырану» (*ανθαίρετον τυραννίδα*) (Dionysius, V: 70: 211; Nicolet, 1994: 34—35). Для рымлянаў тыранія стала канстытуцыйным выбарам у моманты крызісу і ўзяла новыя формы персанальнага кіравання па згодзе.

Радыкальная рэвізія Дыянісія не толькі робіць выклік усталяваным поглядам на дыктатуру, яна таксама ставіць пад пытанне класічнае вызначэнне тыраніі. Напрыклад, з добра вядомага грэцкага вызначэння тыраніі — як асобнае формы кіравання над падпарадкаванымі суб'ектамі супраць закону і для рэалізацыі прыватных інтарэсаў уладара — Дыянісій выкарыстоўвае толькі два апошнія атрыбуты (незаконная і прыватны інтарэс). Пры гэтым скарачае значэнне першага (прымусовае кіраванне) (Aristotle, III: 9: 251, IV: 8: 325—326; V: 8: 441; V: 8: 457; VIII: 10: 491). Як вынік — адсутнасць згоды для тыраніі і яе асацыяцыя з узурпацыяй стала менш важнаю ў выкарыстанні тэрміна. Пры гэтым уладар застаецца найвышэйшым, за межамі закону, з усёй уладаю над суб'ектамі, і ў той самы час шукае задавальнення прыватнага сацыяльнага інтарэсу. У такім выпадку Дыянісій дыстанцуецца ад класічнага вызначэння, якое можна прасачыць у Герадота. Паводле Герадота, тыранія была актам узурпацыі ў парушэнне ўсталяваных нормаў і правілаў, якія рэгулявалі набыццё ўлады (Herodotus, I: 8—15: 11—19). Замест таго Дыянісій звярнуў увагу на прыроду і якасць кіравання самога па сабе, а не сродкаў авалодвання, такім чынам адрозніваючы сябе ад візіі тыраніі як парушэння працэдурных нормаў спадкаемнасці. Такое перафармуляванне тыраніі апярэдзіла сярэднявечнае адрозненне паміж тыраніяй *ex defectu tituli* (у адносінах да нелегітымнага і няўзгодненага атрымання ўлады) і тыраніі *quoad exercitium* (у адносінах да шляху выкарыстання улады).

Гэтае скарачэнне атрыбутаў тыраніі не было поўнай навацыяй, калі прыгадаць катэгорыю Арыстоцеля «выбарная тыранія», якая была часткаю тыпалогіі манархій (Aristotle, III: 9: 247). Арыстоцель вылучыў сярод некалькіх тыпаў манархіі, непадобных адна да адной, але ўтвараючых адзін тып рэжыму, што дазволіла больш складаны кампаратыўны падыход. Падыход Дыянісія поўнасцю засноўваецца на адзіным з тыпаў манархій Арыстоцеля. Цьмяны і практычна невядомы нам архаічны і дадэмакратычны інстытут грэкаў *aesymne-tae,* у адпаведнасці з якім абіраўся ваенны кіраўнік з наданнем дадатковае ўлады, каб захаваць горад ад знешняе пагрозы. Пасля выканання місіі, *aesymne-tae* складаў свае паўнамоцтвы. Арыстоцель лічыў старажытныя практыкі тыранічнымі, бо яны былі абсалютныя па сваёй прыродзе, нягледзячы на тое, што іх асноваю стала падтрымка народа ці выкананне юрыдычных нормаў і працэдураў. Такі рэжым «ёсць па прыродзе тыранічны», пісаў Арыстоцель, «бо ён дэспатычны, але звязаны з манархіяй, таму што заснаваны на выбранні і ўладарыць над суб'ектамі, якія жадаюць гэтага ўладарання» (Aristotle, III: 9: 251). Такім чынам, *aesymne=tae* — гэта гібрыд тыраніі і манархіі, які спалучае абсалютную персаналісцкую ўладу з кансэнсусам у момант знешняе пагрозы (Aristotle, IV: 8: 325—327). Пітакус (Pittacus), уладар Мітылены, для прыкладу, афіцыйна быў *aesymne–tae* перад тым, як стаў легендарным тыранам і адным з сямі мудрацоў (Aristotle, III: 9: 251).

Выкарыстанне Дыянісіям катэгорыі Арыстоцеля «выбарная тыранія» ёсць важным для падсумавання расповеду пра Сулу, чыё дыктатарства, паводле яго словаў, мела адзін пазітыўны, хоць, магчыма, і ненаўмысны эфект. Ён канчаткова завяршыў усведамленне Рымам сапраўднае прыроды інстытута, паколькі было выяўленае рэальнае аблічча дыктатуры ў тэрмінах тыраніі. Дыктатура Сулы была настолькі жорсткая і рэпрэсіўная, што, як пісаў Дыянісій, «рымляне ўпершыню зразумелі тое, што яны доўгі час ігнаравалі: дыктатура — гэта тыранія» (Dionysius, V: 77: 235; Gabba, 1991: 143; Nicolet, 1994: 30). Каментары Дыянісія не абвінавачваюць Сулу за злоўжыванне рымскімі інстытутамі, за надзвычайную ўладу ці за парушэнне канстытуцыйных абмежаванняў, як гэта пазней зробіць Мамзэн у вядомым вызначэнні адрозненняў двух тыпаў дыктатуры (Mommsen, IV: 425—470). Дыянісій таксама не надзяляў свой канцэпт тыраніі такімі суб'ектыўнымі маральнымі катэгорыямі, як персанальная прага ўлады Сулы. Хутчэй, абвінавачанні Дыянісія на адрас Сулы звязаныя з надзвычайным інстытутам дыктатуры самім па сабе, які прыводзіць рэспубліку да тыраніі, нават калі гэта робіцца толькі часова і са згоды. Калі каротка, для Дыянісія Сула быў тыранічным сімптомам дыктатуры, а не яе прычынай.

## III. Апіян і часовая тыранія дыктатуры

Новая афармленая крытычная рэдэфініцыя рэспубліканскіх надзвычайных інстытутаў была далей даследаваная і развітая амаль на паўтара стагоддзя пазней у працах іншага грэцкага гісторыка Апіяна Александрыйскага (Istvan, Hahn: 111—120). Нягледзячы на тое, што падыход Дыянісія значна розніцца ад Апіянавага, гісторыкаў, тым не менш, лучыць агульнае разуменне рымскае дыктатуры. Збольшага іх апісанні дыктатуры дапаўняюць адно аднаго і іх агульнае бачанне тыраніі і дыктатуры выразна розняць іх працы ад іншых (Gowing: 280; Bucher: 420).

У гісторыі Рымскае рэспублікі Апіян паказаў, як падчас грамадзянскае вайны Сула быў абраны ў якасці дыктатара, слізгаючы па тонкай лініі паміж легальнасцю і аноміяй. Пасля паходу на Рым у 82 г. да н. э. і скарыстоўваючы смерць двух консулаў у час грамадзянскае вайны Сула «пераканаў» сенат прызначыць інтэррэкса (*interrex*). Пазней Сула «пераканаў» інтэррэкса не арганізоўваць і не кантраляваць выбары новага консула, але замест гэтага прызначыць яго дыктатарам на нявызначаны перыяд з правам выдаваць законы (Appian, I: 99: 183—185; Mommsen, IV: 440). Інтэррэкс пайшоў за «рэкамендацыямі» Сулы і прапанаваў новы закон, якія быў прыняты аслабленым і дэмаралізаваным сходам цэнтурый, такім чынам фармальна прызначаючы дыктарам Сулу (*βασιλευων δικτάτωρ*) і ўсталёўваючы фактычна дыктатуру праз народныя выбары (Appian, I: 3, 99: 7, 183—185; Kaplan: 144). Нібы гісторыя паўтаралася ў межах толькі некалькіх стагоддзяў, «рымляне віталі гэты выбарчы фарс як толькі бачнасць і сімуляцыю свабоды і прызначылі Сулу як тырана з абсалютнай уладаю (*τύραννον αυτοκράτορα*) на такі тэрмін, які ён хацеў» (Appian, I: 99, 3: 183). «Быццам замкнуўшы кола, рэспубліканскі пачатак сустрэў рэспубліканскі канец у «свавольнай празмернасці» (Appian, II:137: 481).

Як і Дыянісій, Апіян вызначыў дыктатуру Сулы як тыранічную форму кіравання. Што асабліва характарызуе тыранію Сулы, дык гэта тое, што яна не была выкліканая знешнімі абставінамі, але толькі маніпуляцыямі выбарчае працэдуры. Прырода яго кіравання была тыранічнаю не толькі праз шматлікія злачынствы, якія Сула здзяйсняў, і жорсткі тэрор, які ён развязаў. Асаблівасці дыктатуры Сулы нельга патлумачыць толькі яго канцэнтрацыяй заканадаўчай улады (*dictator legibus scribendis et rei publicae consti-tuendae*), што давала яму бязмежнае права выдаваць законы і змяняць канстытуцыю (Nicolet, 1994: 37—39, 42). Хутчэй, тыранічная прырода ўладарання Сулы была ўпісаная ў саму логіку яго дыктатарскай пазіцыі як такой. Як кажа Апіян услед за Дыянісіям, дыктатура сама па сабе — форма тыраніі і такім чынам «нават у мінулым дыктатарская ўлада была тыранічнаю» (Appian, I: 99: 183). Дыктатар заўсёды меў тыранічную ўладу, не зважаючы на працэдурныя парушэнні Сулы і навацыі ў яго кіраўніцтве.

Калі Апіян меў рацыю, то не было розніцы паміж Сулаю і ўсімі папярэднімі дыктатарамі: усе выглядалі на тыранаў. Пры гэтым Апіян усведамляў гістарычную спецыфіку Сула, а менавіта парушэнне часавых межаў дыктатуры, што інтэрпрэтуецца як гістарычная унікальнасць яго кіравання. Прыбіраючы часавыя ліміты, Сула развязаў тыранію, якая лакалізавалася ў межах надзвычайнае пасады і яе страшэннае ўлады. Калі ў мінулым тыранія дыктатара «была абмежаваная кароткім перыядам» (*ολίγω χρόνω δ'όριζομένη*), то з Сулаю яна стала бестэрміноваю (*άόριστος*). Падыход Апіяна нагадвае падыход Плутарха, які стагоддзем раней вызначыў дыктатуру Цэзара як выразна тыранічную, бо яна была вечнай, а Сулу назваў «ні кім іншым, а толькі тыранам». Але Плутарх не дае ўласнае дэфініцыі, гэта зрабіў толькі Апіян ў сваёй гісторыі. Як правільна адзначыў Марыя Турчэцці (Mario Turchetti), «дыктатура была ад пачатку тыранічнаю ўладаю, нават калі яна і была кароткатэрміноваю. Але першым разам, калі яна была дадзеная без абмежаванняў, яна стала ідэальнай тыраніяй» (Turchetti: 163).

Адрозненне паміж дыктатурай і тыраніяй паходзіць ад факта, што першая — гэта абмежаваная форма другой. Дыктатар — часовы тыран, для яго тыранія ёсць кароткатэрміновай, урэгуляванай і абмежаванай. Такім чынам, розніца паміж Сулаю і папярэднімі дыктатарамі была ў тым, што апошнія былі звязаныя межамі. У наратыве Апіяна дыктатар увасабляе ў сабе часовага тырана, абмежаванага і стрыманага, створанага для выканання «тыранічнай улады» (*τυραννικη μαρχην*) толькі ў кароткія моманты сапраўды надзвычайных сітуацый. Паўнамоцтвы дыктара не павінны цягнуцца больш за 6 месяцаў неабмежаванай улады, калі няма магчымасці для апеляцыі і кампенсацыі, калі закон здымае з уладара ланцугі (Appian, I: 3: 7). Як дрымотны тыран у нармальныя часы, ён ляжыць і спіць, прачынаючыся толькі падчас крызісаў, каб несці сваю дыктатарскую мантыю. Будучы прызначаны на няпэўны перыяд, Сула, падаецца, вы-

канаў тыранічную логіку дыктатуры. Ад абмежаванай тыраніі, перыядычнай і сегментаванай, Сула рушыў да такой формы тыраніі, якую Апіян назваў чыстай і абсалютнай (*εντελής τυραννίς*) (Appian, I: 99: 183—184).

Аргументы Апіяна далікатныя, але вырашальныя. Канстытуцыйныя прынцыпы часавых абмежаванняў вызначаюць не сутнасную розніцу паміж гэтымі дзвюма формамі ўлады, а, хутчэй, унутраную дыферэнцыяцыю ступеняў паміж абмежаванай і неабмежаванай тыраніяй. Дзве версіі аднае тэмы: дыктатар — гэта часовы тыран, і тыран — гэта пастаянны дыктатар. Кіраванне Сулы, такім чынам, адначасова і тыповая, і унікальная ў рэалізацыі тыранічнае прыроды дыктатуры праз яе вызваленне ад часавых межаў. Вызначаючы дыктатуру як часовую тыранію і тыранію як пастаянную дыктатуру, Апіян зафіксаваў глыбокае падабенства паміж двума канцэптамі і такім чынам пацвердзіў погляды Дыянісія на дыктатуру як тыранічную па сваёй прыродзе.

Калі быць дакладным, то ацэнкі Апіяна не ідэнтычныя ацэнкам Дыянісія. Умовы і інтэнцыі — як і гістарычны, біяграфічны, культурны і палітычны кантэксты іх важных працаў — моцна разыходзіліся. Нават па пытанні дыктатуры існуюць пэўныя адрозненні ў танальнасці і арыентацыі. Апіян, як падаецца, непаслядоўны ў вызначэнні тыранічных наступстваў дыктатуры: так, у адным месцы ён паказвае, як у мінулым дыктатура выратавала Рым. Такім чынам, прызнаецца, што гэтая надзвычайная пасада «была карысная раней» (Appian, I:16: 33). Тым не менш, не зразумела, чаму ён выкладае такія ацэнкі і як гэта суадносіцца з больш сістэматычным і змястоўным назіраннем за роляй дыктатуры ў заняпадзе рэспублікі, калі не прыгадваецца ніводнае пазітыўнае перавагі. Магчыма, Апіян меў прагматычныя погляды, у адпаведнасці з якімі дыктатар як кароткатэрміновы тыран мог быць карысны ў асобных сітуацыях. Але застаецца фактам, што нават у такім выпадку гісторык прытрымліваўся апісання дыктатуры як абсалютнае ўлады, з гэтае пазіцыі ён цалкам паслядоўны ў аналізе інстытута дыктатуры як тыранічнага і неабмежаванага і цалкам салідарны ў версіях з Дыянісіем. Такім чынам, калі ў апісанні і разуменні прыроды дыктатуры падабенства паміж двума грэцкімі гісторыкамі больш заўважнае і відавочнае, чым адрозненні.

## IV. Дыктатура і легалізацыя тыраніі

Найбольшы арыгінальны ўнёсак Дыянісія і Апіяна — гэта разуменне прысутнасці тыранічнага ў рэспубліканскіх інстытутах дыктатуры. Праз тое абодва грэцкія гісторыкі пачалі моцную рэвізію старажытнага рэспубліканізму і яго крытычнае перафармуляванне. Асноўнае і найбольш істотнае — неартадаксальная рэдэфініцыя інстытута дыктатуры, што разумеецца як «часовая тыранія па згодзе». Такая рэдэфініцыя стала навацыяй у тэорыі рымскіх інстытутаў «легалізаванае тыраніі». Дыктатура прадстаўляе легалізацыю тыраніі, калі тыран легальна прызначаецца ў надзвычайных выпадках у адпаведнасці з рэспубліканскай канстытуцыяй для аховы існага парадку ў момант небяспекі. Як прызнаваў Цыцэрон (але толькі ў асобным выпадку для Сулы і без абагульняльных высноваў), «у іншых гарадах, калі ўсталяваная тыранія, усе законы знікаюць і разбураюцца. У рэспубліцы ўсталяванне тырана робіцца па законе. Як легалізаваная і працэдурная тыранія дыктатура ўвасабляе жаданне ўтаймоўваць і кантраляваць тырана. Існуе жаданне выкарыстоўваць вярхоўную ўладу дзеля яе пераваг, у імя любові да краіны, каб мець магчымасць камандаваць тыранам і скіроўваць яго без усялякіх абмежаванняў супраць ворагаў для ўласнага калектыўнага выжывання. Легальная тыранія абяцае, што абсалютная ўлада за межамі закону можа быць утаймаваная без страты свайго рэпрэсіўнага эфекту.

Другі вынік звязаны з тым, што атыповы погляд на дыктатуру як легальную тыранію ўтрымліваў выклік гістарыяграфіі часоў Дыянісія і Апіяна. Напрыклад, пазіцыі двух гісторыкаў вельмі моцна розняцца ад апісання Лівія. Для рымскага гісторыка права апеляцыі спыняецца падчас тэрміну дыктатарскіх паўнамоцтваў, але можа быць адноўленае пасля яго адстаўкі. Акрамя гэтага, рэспубліка дазваляла падаваць позвы ў суд на дыктатара як прыватную асобу. Лівій узгадаў, праўда, толькі адзін такі выпадак, калі дыктатар Гай Маніюс (Gaius Manius) і яго конюх былі прыцягнутыя да суда пасля завяршэння службы ў 314 г. да н. э. (Livy, 9: 26: 263—267; Kaplan: 93—94; Lintott:112). На жаль, мы не можам ведаць, як Дыянісій і Апіян апісвалі гэтую падзею, бо часткі іх гісторый, якія маглі ўказваць на яе, не дайшлі да нашага часу. Праз тое, што гістарычныя крыніцы вельмі абмежаваныя, а тыя, што захаваліся, супярэчлівыя, цяпер мы не можам абаперціся на сведчанні, каб параўнаць версіі Дыянісія і Апіяна, з аднаго боку, і Лівія — з другога. Праблема ацэнкі дыктатуры застаецца нявырашанай і супярэчлівай. Эндру Лінтот, які схіляецца да пазіцыі Лівія па гэтым пытанні, прызнае, што «тое,

наколькі абсалютнай была ўлада дыктатара, падаецца, было прадметам дыскусіі, якая вырашалася не статусам ці дакладнымі правіламі, але абставінамі і довадамі. Ацэнкі дыктатуры заставалася спрэчнымі ў час, калі стала развівацца гістарычная традыцыя апошніх двух стагоддзяў Рэспублікі. Як і ў выпадку з нявызначанымі канстытуцыйнымі пытаннямі, розныя пазіцыі адлюстроўваюць альбо арыстакратычную, аўтарытарную ідэалогію, альбо народную, якая адстойвала свабоду» (Lintott: 112).

Тут пытанне не ў тым, каб выбраць паміж Лівіям, з аднаго боку, Дыянісіям і Апіянам, з другога, у бясплённым пошуку гістарычнае аб’ектыўнасці, а ў тым, каб, хутчэй, падсумаваць арыгінальнасць двух менш вядомых, недаацэненых версій разумення дыктатуры, якія адзіныя дайшлі да нашага часу і якія прытрымліваюцца тыранічнага апісання гэтага надзвычайнага рымскага інстытута. Калі дзве супярэчлівыя інтэрпрэтацыі ўспрымаць сур’ёзна, мы не толькі будзем сведкамі станаўлення ў старажытнасці таго, што Мелвін Рычтэр (Melvin Richter) назваў «канцэпцыяй сям’і», але мы таксама атрымаем прывілеяваны доступ да незвычайнай рэвізіі класічнага рэспубліканскага тыпу рэжыму.

Грэка-рымскі сінтэз Апіяна і Дыянісія змянілі нарматыўныя канатацыі, якія звязваліся з класічнымі ідэаламі дыктатуры. Гэта дэмістыфікавала рэспубліканскі партрэт дыктатара і паказала монстра, якія хаваецца за героем, воўка ўнутры салдата і бязладдзе (аномію), якое паглынае закон. Рост рэпутацыі дыктатуры спалучаўся з аўрай шляхетнасці і этычным увасабленнем грамадзянскае дабрадзейнасці і патрыятызму, але цяпер увесь інстытуцыянальны і аратарскі арнамент адкінуты, каб паказаць, што дыктатура — гэта іншая назва тыраніі. У выніку гісторыкі выкрылі тыранічнае зерне, схаванае ўнутры інстытуцыянальнага механізму рэспубліканскага кіравання.

Больш за тое, далейшыя адгалінаванні ад поглядаў Дыянісія і Апіяна паставілі пад пытанне больш познія спробы, у прыватнасці Мамзэна і Карла Шміта, выявіць адрозненні паміж рознымі дыктатурамі: старажытнай дыктатурай і яе радыкальным перараджэннем у асобе Сулы і Цэзара (Mommsen, III: 193—194; IV: 425—470; Schmitt, 1994: 3; Nicolet, 1994: 265—276). У супрацьвагу падвойнаму разуменню тыпаў дыктатуры — ваенная (commissarial) і выбарная (constituent) — абодва грэцкія гісторыкі ўказалі на гістарычную непарыўнасць і інстытуцыйную пераймальнасць рымскае дыктатуры. У святле такое гістарычнае рэвізіі мінулага Рыма, тыранічная дыктатура Сулы губляе свае выключныя і інавацыйныя ўласцівасці. Гэта больш не недарэчная анамалія і не летуценная выпадковасць. Дыктатура Сулы не абазначала перарыву гісторыі інстытута. Насуперак гэтаму яна ўспрымалася як рэпрэсіўная, але пастаянная, унутраная тыранічная магчымасць улады дыктатара. Тыранія, такім чынам, бачыцца як інтэгральная частка дыктатуры, яе формы могуць розніцца з фармальнага пункту гледжання, але падобныя па сутнасці. Фактычна два грэцкія гісторыкі не лічылі кіраванне Сулы выключным ці прарывам. Гэта было магчыма толькі таму, што яны змясцілі тыранічныя ўчынкі ў межы структуры і логікі надзвычайнай пасады дыктатара (Hinard: 87—105).

Тут можна знайсці трагічную іронію і нават паэтычную справядлівасць гісторыі Апіяна і Дыянісія. Нягледзячы на тое, што рымляне ганарыліся звяржэннем манархіі, падняўшы выгнанне Тарквінія да фундаментальнага рэспубліканскага міфа, інстытуцыйнага акта антытыраніі, яны ўрэшце не былі здольныя пазбавіць сябе ад (дрэнных) манархаў (Appian, I: 11: 185; Plutarch, II—III: 569—575; Dio Cassius, IV:13 (Zonaras):109; Aristotle, V: 9; 467). Разам з шанаваннем саміх сабе за законнасць, адданасць праву, патрыятычную павагу да традыцый і звычаяў рымляне адкрылі перманентны прабел, унутраную шчыліну ў прававым канструкце ўласнае рэспублікі. Каб ратаваць горад, канстытуцыя стварыла вольнае, пустое месца ў законе, прастору *a-nomia*, куды прыйшоў дыктатар, каб сустрэць тырана і ў агульных амбіцыях запоўніць уладу, якую раней займаў манарх. Іранічна, аднак, нягледзячы на тое, што рымляне мелі нянавісць да манархаў (*odium regni*), выгнанне Тарквінія і калегіяльнасць кіравання консулаў, тыранія ніколі не была сапраўды выгнаная з горада, але знайшла прытулак у межах рэспубліканскага інстытута дыктатара (Martin: 3—11). Праз захаванне манархападобнай улады рымляне «ненаўмысна» захавалі свой тыранічны патэнцыял і не ажыццявілі поўнага разрыву з манархічным мінулым (Mommsen, III: 193; Dio Cassius, IV: 13 (Zonaras): 107). Фактычна манархія, чыя забарона была скіраваная на абарону свабоды, была захаваная рэспублікай у «мінімальнай» форме дыктатуры для абароны горада ў найбольш уражальныя моманты (Dio Cassius, IV: 13 (Zonaras): 107).

У Рымскай рэспубліцы вораг свабоды быў узняты да ўзроўню яе абаронцы. І тое, што павінна было скарыстоўвацца супраць унутраных і знешніх ворагаў, ужылі супраць самой рымскае канстыту-

цыі, якая пала ахвяраю свайго небяспечнага стварэння. Спрабуючы ўзмацніць выканаўчую ўладу за межамі закону, канстытуцыя ў выніку патрапіла ва ўласную пастку, падарваўшы свабоду, якая ўтрымлівала яе сутнасць і ідэнтычнасць. Такім чынам, адбыўся імпарт тыраніі ў рэспубліку пасля выгнання манархаў пад выглядам «надзвычайнай улады». Старажытныя рымляне зрабілі лёсавызначальны выбар, які прывёў да страты свабоды. Страта *libertas* — таго, што грамадзяне баяліся і ненавідзелі больш за ўсё, — у выніку стала рэальнасцю. У выпадку Сулы і Цэзара дыктатура поўнасцю паказала сваю моц: тыран у свабодным горадзе — траянскі конь, які знаходзіцца ў сэрцы рымскае канстытуцыі. Такім чынам Тарквіній, магчыма, быў пераможаны, але яго тыранічная ўлада выжыла ў новым надзвычайным інстытуце. Пазней яна вярнулася з помстаю, каб іграць актыўную ролю ў канфліктах і прывесці рэспубліку да краху.

Шмат стагоддзяў пазней новая інтэрпрэтацыя дыктатуры будзе паўставаць ў мадэрным палітычным мысленні ва ўмовах радыкальна іншага гістарычнага кантэксту. З вяртаннем дыктатуры і яе пашырэннем праз рэспубліканскую дактрыну палітыкі была па-новаму адкрытая яе тыранічная прырода. З гэтага багатага і паказальнага перыяду адзін важны прыклад стаіць збоку. Менавіта Джэферсан уваскрасіў аналіз Дыянісія і Апіяна і давёў яго да фінальнага завяршэння. У адным з раздзелаў «*Notes on Virginia*», твора, які пазначаў недахопы канстытуцыі штата Вірджынія, ён аспрэчыў прапановы, зробленыя ў 1777 і 1781 гадах «па стварэнні *дыктатара*, які б меў заканадаўчую, выканаўчую і судовую ўладу, грамадзянскую і ваенную, над жыццём і смерцю, асобаю і ўласнасцю» (Jefferson, 1999: 332).

Джэферсан выкарыстоўваў сваю нязгоду з гэтымі прапановамі як нагоду для аспрэчвання дыктатуры і больш красамоўна — для атакі на тыранію. Каментуючы рымлянаў, ён папракаў іх рэспубліканскую канстытуцыю за «дазвол усталявання *часовае тыраніі*, пад назваю Дыктатуры, і гэтае часовая тыранія, за выключэннем некалькіх выпадкаў, станавілася вечнай» (Jefferson, 1999: 335). Часовасць — гэта ключавая ўласцівасць, якая змешвае тыранію і дыктатуру разам. Больш прадбачлівы, чым Апіян і Дыянісій, Джэферсан падкрэсліваў ступень дэструктыўнага патэнцыялу тыранічнага кіравання, які, на яго думку, не можа быць утаймаваны і рэгуляваны ў форме дыктатуры. Часовыя абмежаванні не будуць працягвацца вечна, назаўсёды звязваючы надзвычайны механізм уладарання і прымушаючы яго дзейнічаць на карысць захавання рэспублікі. Аднойчы ўключаная ў канстытуцыйнае ўладкаванне дыктатуры, тыранія становіцца пастаяннай, унутранай пагрозаю для самога ўладкавання. Пагроза расце, бо тыранія не можа быць утаймаванай ці цалкам адаптаванай у межах інстытуцыйнага механізму ці быць схаванай пад скляпеннем канстытуцыйнай сістэмы змяшанае ўлады. Замест гэтага адбудзецца парушэнне балансу змяшанае канстытуцыі. Тыран, якія схаваны ў дыктатары, пастаянна будзе імкнуцца пазбавіць сябе ад прававых абмежаванняў і змяніць рамкі канстытуцыі.

Старажытныя грэкі рана адзначылі гэты некіраваны працэс тыраніі ў класічнае палітычнае філасофіі. Тыранія як форма кіравання ёсць празмерная, «неабмежаванаю» (*ἀόριστος τυραννίς*), таму прагне абсалютнае суверэннасці (*ἁπάντων κύριός*) (Aristotle, I: 8: 89). Паводле Герадота, яна заўсёды даводзіць да шаленства, бо жаданні тырана не могуць быць задаволеныя цалкам (Herodotus, III: 81: 107). Апісанне тыраніі Платонам таксама паказальнае. «Тыранічнае жыццё — гэта жыццё ненажэрнае распуты», якое Сакрат закляйміў як «заўсёды жаднае, пакута ад нявыкананых жаданняў» (Plato: 417). Гэтае класічнае апісанне тыраніі ўлады ставіць пад пытанне здольнасць прававымі сродкамі рэгуляваць дыктатуру.

Джэферсан не ўхіляецца ад апісання сутнасці дыктатуры. Рымская канстытуцыя была самагубная па простай прычыне: дыктатура стала «сапраўды фатальнай» для рэспублікі, але яна таксама была неабходная ёй (Jefferson: 334). Рымская канстытуцыя была схопленая ў смяротны парадокс: яе фракцыйная палітыка, «жорсткая арыстакратыя» і «дзікі», збяднелы народ зрабіў яе выжыванне ў момант унутранае нязгоды залежным ад тырана, якія вырятаваў рэспубліку толькі для таго, каб разбурыць яе ўласнаручна ў больш позні перыяд (Jefferson: 334—335). Тут і ляжыць парадокс Джэферсана: па сваёй прыродзе Рымская рэспубліка не магла пераўжыць надзвычайныя сітуацыі без дапаможнай тыраніі — той формы кіравання, якая пагражала яе існаванню. У выніку інструмент, які спрыяў выжыванню, стаў прыладаю падзення рэспублікі. «Лекавы сродак» дыктатуры горшы за хваробу, але пры гэтым мае вялікае значэнне (Jefferson: 335; Mommsen, III: 169).Тут склалася парадаксальная сітуацыя: інстытуцыя, істотная для выжывання старажытнае рэспублікі, стала прычынаю яе канчатковага падзення. Парадокс Джэферсана ставіць пад пытанне ідэалы рэспубліканскае канстытуцыі і, у прыватнасці, патрабаванне

яе стабільнасці і пастаянства, якое падтрымлівалася інстытуцыйнай раўнавагаю.

Зусім не супадзенне тое, што Джэферсан быў асабліва жорсткі ў ацэнках рымскага рэспубліканізму: яго структурны дэфектануляваў усе іншыя перавагі і, такім чынам, ён перастаў быць мадэллю для капіявання (Jefferson: 334—335).

Акрамя пытання гістарычнай рэцэпцыі існуе і больш шырокае — парадоксу. Калі Дыянісій і Апіян маюць рацыю і дыктатура — на самай справе іншая назва тыранічнага кіравання, становяцца відавочнымі істотныя гістарычныя і палітычныя адрозненні паміж Афінскай і Рымскай рэспублікамі. Зліццё дыктатара і тырана ў такой інтэрпрэтацыі забяспечвае унікальны канцэпт для прадумвання больш шырокага кантэксту адносінаў паміж двума старажытнымі рэжымамі і падабенства ацэнкі рымскага досведу дыктатуры з бягучымі дыскусіямі пра надзвычайную ўладу і канстытуцыйны рэжым выключэння ў ліберальных дэмакратыях (Schmitt; Rossiter: 3—32, 288—314).

Нягледзячы на тое, што дэмакратычныя Афіны і рэспубліканскі Рым часта ідэнтыфікуюцца як два архітыпічна свабодныя рэжымы Антычнасці, яны разыходзяцца па вырашальным пытанні ролі абсалютнай, аўтакратычнай улады ў межах палітычных і прававых рамак. У той час як Афіны забаранілі тыранічную форму ўлады ў імя свабоды, Рымская рэспубліка легалізавала яе таксама ў імя свабоды. Тое, што было выключана з канстытуцыйнага ўладкавання Афінаў, поўнасцю патрапіла ў змяшаны рэжым Рыма.

У творах Дыянісія і Апіяна гэта выглядае такім чынам. Рымская канстытуцыя бяздумна вітала тырана, каб перасекчы лінію, якая падзяляла стан прыроды (і вайны) і горад. Дыктатура — вынік рэспубліканскае інавацыі. Старажытная дэмакратыя Грэцыі была адзіным вядомым нам рэжымам, які меў заканадаўства супраць тыранаў («грамадскіх ворагаў», *πολέμιος*) і ўхваляла яго забойства. Тыран не толькі быў па-за законам, але «ў Афінах не было нормаў у канстытуцыі, у якіх утрымліваліся надзвычайныя нормы, падобныя да рымскіх tumultus ці сучаснага ваеннага (martial) права» (Bonner: 144). Калі разглядаць гэтыя адрозненні з перспектывы гісторый Дыянісія і Апіяна, то атрымаецца, што ў дэмакратычных Афінах тыран быў вораг, якому трэба было супрацьстаяць, а ў рэспубліканскім Рыме ён быў сябра, на якога разлічвалі. Гэта былі вельмі розныя адносіны да тыранічнае ўлады.

Адрозненне вельмі істотнае, бо яно паказвае, што калі ў гістарычнай перспектыве рэспубліка магла ўключаць тыранію дыктатара, то дэмакратыя такога не дазваляла. Гэта таксама адзначае два розныя падыходы да ўлады, яе маштаб і кірунак, яе адносіны з законам. З перспектывы дэмакратычнага, антытыранічнага права фігура часовага тырана можа выглядаць не толькі парадаксальнай, але і глыбока неразумнай і небяспечнай. Як такое магчыма, што ў сітуацыі крызісу свабодны горад апелюе да тырана для ўласнага выратавання як да адзінага сродку ўсталяваць парадак? Ці можа тыран, якога Цыцэрон апісаў услед за Платонам як «найбольшага монстра, падобнага да дзікіх жывёлаў у сваёй жорсткасці па прыродзе... які не жадае быць звязаным агульным правам і быць партнёрам у чалавечым жыцці разам з сваімі грамадзянамі», быць канстытуцыйным фактам як вартавы рэспублікі? (Cicero, II: 26: 157; Plato, VIII, 566b: 321).

І нарэшце, найбольш істотнае, Дыянісій і Апіян дапамаглі нам зачапіць палітычна далікатнае пытанне. Ці мэтазгодна для грамадзянаў канстытуцыйнае дэмакратыі даваць надзвычайную ўладу з меркаванняў бяспекі (нават калі размова ідзе пра часовыя канстытуцыйна вызначаныя абмежаванні) пасадзе, якая стаіць у нявызначаных стасунках да ўлады закону (Mommsen, IV: 187)? Асабліва ў час, калі дэмакратычная рэспубліка жадае ці моўчкі выбірае прыпыненне некаторых з яе канстытуцыйных свабодаў для забеспячэння большае бяспекі. Натуральна, не трэба шукаць у старажытных гісторыях дакладных адказаў для развязання сённяшніх праблемаў і дылемаў у адносінах да канстытуцыйнае дыктатуры і пагрозы тэрарызму. Але менавіта праз сведчанні грэцкіх гісторыкаў, што рымская дыктатура атрымлівае таксама выгляд дэмакратычнае легітымнасці і ўключае ў сябе электаральную згоду, іх даследаванні пра паходжанне і ўплывы надзвычайнае старажытнае інстытуцыі могуць стацца інфармацыйнымі, крытычнымі і палітычна вострымі для разумення інстытута надзвычайнага становішча ў ліберальных дэмакратыях. Спадчына грэцкіх гісторыкаў замяніла пытанне «Ці могуць грамадзяне (іх выбраныя прадстаўнікі) у надзвычайным перыядзе крызісу апеляваць да дыктатара?» на больш фундаментальнае пытанне пра адносныя перавагі тыраніі і яе непрадказальныя і контрпрадуктыўныя наступствы.

Пераклад з англійскай мовы Вольгі Казакевіч паводле: *Andreas Kalyvas*. The Tyranny of Dictatorship. When the Greek Tyrant Met the Roman Dictator // Political Theory Volume 35 Number 4 August 2007 412—442.
Друкуецца з ласкавае згоды аўтара.

**Літаратура**


1. Appian. Roman History: The Civil Wars. Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 2002.
2. Aristotle. Nicomachean Ethics. Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 1999.
3. Aristotle. Politics. Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 1990.
4. Béranger, J. Tyrannus: Notes sur la notion de la tyrannie chez les Romains particuliérement a l'époque de César et de Cicéron // Revue de études Latines, 13 (1935).
5. Bobbio, Norberto. Democracy and Dictatorship / Peter Kennedy (trans.). Minneapolis: University of Minnesota Press, 1989.
6. Bonner, Robert J. Emergency Government in Rome and Athens // The Classical Journal, 18:3 (1922).
7. Bucher, Gregory S. The Origins, Program, and Composition of Appian's Roman History // Transactions of the American Philological Association, 130 (2000).
8. Cicero. De Re Publica, Cambridge, Mass.: Harvard University Press.
9. Cohen, D. The Origin of Roman Dictatorship // Mnemosyne, 4:10 (1957).
10. Cornell, T. J. The formation of the historical tradition of early Rome // Past Perspectives. Studies in Greek and Roman Historical Writings.
11. Dio Cassius. Roman History. Cambridge, Mass.: Harvard University Press. 2001.
12. Diogenes Laertius. «Plato» Lives of Eminent Philosophers. Vol. I. Cambridge: Mass.: Harvard University Press, 2000.
13. Dionysius of Halicarnassus. Roman Antiquities. Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 1971.
14. Dunkle, Roger. The Rhetorical Tyrant in Roman Historiography: Sallust, Livy, Tacitus // Classical World, 65 (1971).
15. Fox, Matthew. History and Rhetoric in Dionysius of Halicarnassus // The Journal of Roman Studies, 83 (1993).
16. Gabba, Emilio. Dionysius and the History of Archaic Rome, Berkeley: University of California Press, 1991.
17. Gowing, Alain M. The Triumviral Narratives of Appian and Cassius Dio. Ann Arbor: The University of Michigan Press, 1992.
18. Hearnshaw, Fossey John Cobb. Democracy or Dictatorships? // The Contemporary Review, 286 (1934).
19. Hinard, Franēois. De la dictature ąla tyrannie. Réflexions sur la dictature de Sylla / Franēois Hinard (ed.) // Dictatures. Actes de la Table ronde de Paris, 27-28 février 1984, Paris: De Boccard, 1988.
20. Herodotus. Histories. Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 1995.
21. Istvan, Hahn. Appians Darstellung der sullanischen Diktatur // Acta classica Universitatis Scientiarum Debreceniensis, 10—11 (1974—1975).
22. Jeannin, Pierre. Cromwell: une dictature introuvable? // Maurice Duverger. Dictatures et Légitimité. Paris: PUF, 1982.
23. Jefferson, Thomas. Political Writings, Cambridge: Cambridge University Press, 1999.
24. Jerphagnon, Lucien. Que le tyran est contre-nature. Sur quelques clichés de l'historiography romaine // Actes du Colloque: La Tyrannie. Centre de Publication de l'Université de Caen: Cahiers de philosophie politique et juridique, 1984.
25. Kaplan, Arthur. Dictatorships and «Ultimate» Degrees in the Early Roman Republic 501—201 BC. New York: Revisionist Press, 1977.
26. Keyes, Clifton Walker. The Constitutional Position of the Roman Dictatorship // Studies in Philology, 14 (1917).
27. Lintott, Andrew. The Constitution of the Roman Republic. Oxford: Oxford University Press, 1999.
28. Livy. History of Rome. Cambridge, Mass.: Harvard University Press. 1998.
29. Mansfield, Harvey C. Taming the Prince. The Ambivalence of Modern Executive Power, Baltimore: The Johns Hopkins University Press, 1989.
30. Martin, Paul M. L'idée de royaté ąRome. Vol. I. De la Rome royale au consensus républicain. Paris: Adosa, 1982.
31. Michel, Alain. La philosophie politique a Rome d'Auguste a Marc Aurčle. Paris: Armand Colin, 1969.
32. Millon-Delson, Chantal. Dictature et despotisme, chez les Anciens et chez les Modernes // Revue Française D'Histoire des Idées Politiques, 6 (1997).
33. Mommsen, Theodor. Le droit public romain, Paris: Thorin et fils, Éditeurs. Vol. III, 1893. Vol. IV, 1894.
34. Mosca, Gaetano. The Ruling Class / Hannah D. Kahn (trans.). New York: McGrawn-Hill Book Company, 1939.
35. Nicolet, Claude. Dictatorship in Rome / P. Baehr and M. Richter (eds.) // Dictatorship in History and Theory. Bonapartism, Caesarism, and Totalitarianism. Cambridge: Cambridge University Press, 2004.
36. Nicolet, Claude. L'idée républicaine en france (1789—1924). Paris: Gallimard, 1994.
37. Plato. The Republic. Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 1994.
38. Plato. Gorgias. Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 1996.
39. Plutarch. Publicola // Lives. Vol. I, Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 1998, sections xi-xii.
40. Polybius. The Histories. Cambridge, Mass.: Harvard University Press.
41. Res Gestae Divi Augusti. Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 2002.
42. Rossiter, Clinton. Constitutional Dictatorship: Crisis Government in the Modern Democracies. New Brunswick: Transaction Publishers, 2004.
43. Sartori, Giovanni. The Theory of Democracy Revised. Vol. I, Chatham, New Jersey: Chatham House Publishers, 1987.
44. Schultze, Clemence. Dionysius of Halicarnassus and his audience // Past Perspectives. Studies in Greek and Roman Historical Writings.
45. Schmitt, Carl. Die Dictatur, Berlin: Duncker und Humblot, 1994.
46. Syme, Ronald. The Roman Revolution, Oxford: Oxford University Press, 2002.
47. Turchetti, Mario. Tyrannie et Tyrannicide de l'Antiquitй a nos jours. Paris: Presses Universitaires de France, 2001.
48. Wood, Neal. Cicero's Social and Political Thought. Berkeley: University of California Press, 1988.
49. Xenophon. Hieron // Scripta Minora. Cambridge, Mass.: Harvard University Press, 2000.
50. Zaller, R. The Figure of the Tyrant in English Revolutionary Thought // Journal of the History of Political Ideas, 54 (1993).